БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. №

№ 45 (734)
Снежань 2018 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

## У нумары:

Асоба: *тэктанічныя зрухі Радзіма Гарэцкага* – *стар. 3*

Малая радзіма: гістарычнае Гродна ў мініяцюры – *стар. 4*

Землякі: фестываль народаў, *што жывуць поруч* – *стар. 5*



*На фота Наталі КУПРЭВІЧ: аўтарскі калектыў кнігі і народныя артысты*

# Страла свету

***Наведнікі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь нядаўна мелі магчымасць дакрануцца да архаічнага пласта традыцыйнай культуры, пабачыць які ў сённяшнім глабалізаваным свеце, мабыць, не прасцей, чым у антычныя часы – пераплыць раку Сцікс. У ролі «перавозчыкаў праз раку забыцця» для нашых сучаснікаў на гэты раз выступілі аўтары серыі выданняў «Інтэгратыўная фалькларыстыка», першы выпуск якой «Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі» акурат і быў прадстаўлены ў музеі. У першую кнігу серыі паводле задумы яе ўкладальнікаў Рымы Кавалёвай і Вячаслава Калацэя ўвайшлі матэрыялы, прысвечаныя абраду ваджэння і пахавання «стралы», які штогод ладзіцца на Ушэсце ў сумежных рэгіёнах Беларусі, Расіі і Украіны, а ў Рэспубліцы Беларусь – уключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны.***



Сама серыя «Інтэгратыўная фалькларыстыка», заснаваная сёлета, неўзабаве мусіць сістэмна абагульніць амаль 30-гадовы досвед плённай працы вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ (па фіксацыі і аналізе фальклору) і 15-гадовы досвед кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ (па ахове і перыядычнай рэвіталізацыі шэрагу найбольш знакавых элементаў мастацтва вуснай традыцыі беларусаў) з актуальнымі сёння трэндамі народазнаўства і даследаванняў традыцыйных культураў свету.

Наведнікі прэзентацыі першага выдання серыі мелі магчымасць пазнаёміцца з кнігай «Цень Стралы», а таксама набыць яе. Эфект паглыблення ў традыцыю быў аздоблены спевамі аўтэнтычнага гурта «Стаўбунскія вячоркі» Святланы Парашчанкі з вёскі Стаўбун і мінскага постфальклорнага гурта «Страла» Эвеліны Шчадрыной, а таксама дэманстрацыяй кінастужкі пра «Стралу» ў жанры аўдыявізуальнай антрапалогіі.



Абрад «Страла» звязаны з землямі Падняпроўя, іх урадлівасцю і дабрабытам мясцовых жыхароў. Ён мае глыбокія карані, вяскоўцы сёння часам самі і не ўзгадаюць, з чаго ўсё пачалося. Але мадэль свята стагоддзямі застаецца нязменнай: у час апошняга маладзіка вясны мясцовыя жанчыны прыбіраюцца ў святочныя строі ды ідуць вёскаю, спяваючы «стрэльныя» песні (песні, што паўплывалі як на музыку Пятра Чайкоўскага, так і на творчасць цяперашніх рок-гуртоў). Карагодніцы рухаюцца да жыта, дзе закопваюць у зямлі «стралу», хаваючы цёмную сілу разбурэння Сусвету, пераўтвараючы яе ў дабро, плоднасць і поспех.

Настрой імпрэзы ў музеі быў відавочна светлым і скіраваным на станоўчае, а яе метатэкст можна абагульніць як: «Спадчына Беларусі – сёння жыве, не грэбуйце і шануйце яе; яна вас – абераджэ і адорыць».

*Ілля МАСІБУТ,*
*Максім ЯШЧЫНКА,*
*этнафонаязнаўцы*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*